# «ЖНІЦЕ, ЖНЕЙКІ МАЛАДЫЯ!»



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Прысвятак беларускага народнага календара, які адзначалі 7 жніўня. («Святая ... снапы кладзе» (прык.). **6.** Прыйшоў ... — лета шась! (прык.). **9.** «Жніце, жнейкі маладыя, \\ У вас ... залатыя». З беларускай народнай песні. **11.** Ілля блізка: гніся, ..., нізка, уставай раненька ды жні дапазненька (прык.). **12.** «А жнейкі жнуць. У моры ... \\ Мільгае постаць іх прыгожа». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля» («Летнім часам»). **13.** Агародная расліна; ужываецца як прыправа да ежы. **17.** Добры казляк лепей за кепскае ... (прык.). **18.** ... сноп ды сто коп — хлеба на год (прык.). **20.** Ілля ... пачынае, а лета канчае (прык.); прысвятак Ілля, або Галляш, адзначаўся 2 жніўня. **21.** Хвораму дапамагае ..., а галоднаму — калач (прык.). **23.** Белы клён. **24.** «Шлі ..., урок, — \\ Не збаяўся хлябок! \\ Памажы, божа, толькі зажаць». З верша Я.Купалы «Зажынкі». **27.** Што ... ўродзіць, жнівень знаходзіць (прык.). **30.** Невялікае памяшканне для майстра, кіраўніка цэха. **31.** Калі паспелі чарніцы, паспела і ... (прыкмета). **32.** ... ласку любіць (прык.).

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** У каго чорна ..., у таго й хлеба скіба (прык.). **2.** Орган размнажэння ў грыбоў. **3.** Як кусок сала, то і ... патрава (прык.). **4.** Тое, што і праснак. **5.** Яда з дробна пасечанай гародніны, грыбоў. **7.** 16-я літара грэчаскага алфавіта. **8.** Назва жніўня ў выданнях Ф.Скарыны. **10.** Калючая кустовая расліна з ядомымі кісляватымі ягадамі. **14.** На зімовы стол жнівень рыхтуе ... (прык.). **15.** Гнаёк ды лубінок — хлеба і на другі ... (прык.). **16.** Вечназялёны балотны зараснік з дурманным пахам. **19.** Штучна выкліканае ўзбуджэнне з мэтай прыцягнення ўвагі да чаго-небудзь. **22.** Будзе хлеб — будзе і ... (прык.). **24.** «Хлеб — ... любові і духоўнага багацця, \\ З чым і жыве пад сонцам беларус». З верша М.Курылы «Песня пра хлеб». **25.** У жніўні ... насустрач восені бяжыць падскокамі (прык.). **26.** ... Магдалена; прысвятак, які адзначалі 4 жніўня («Магдалена — вады па калена» (прык.). **28.** Шырокая і неглыбокая пасудзіна. **29.** Кармавая частка верхняй палубы судна.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Ганна. 6. Спас. 9. Сярпочкі. 11. Баба. 12. Збожжа. 13. Кроп. 17. Маса. 18. Адзін. 20. Жніво. 21. Урач. 23. Явар. 24. Заломы. 27. Поле. 30. Канторка. 31. Жыта. 32. Зямля. **Па вертыкалі:** 1. Глыба. 2. Аск. 3. Грыб. 4. Корж. 5. Ікра. 7. Пі. 8. Серпень. 10. Абляпіха. 14. Разнасол. 15. Гадок. 16. Багун. 19. Ажыятаж. 22. Песня. 24. Знак. 25. Лета. 26. Мар'я. 28. Таз. 29. Ют.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.19 | 21.12 | 15.53 |
| Віцебск — | 5.02 | 21.08 | 16.06 |
| Магілёў — | 5.09 | 21.02 | 15.53 |
| Гомель — | 5.12 | 20.52 | 15.40 |
| Гродна — | 5.35 | 21.27 | 15.52 |
| Брэст — | 5.43 | 21.20 | 15.37 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 27.07—01.08.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

***Пр.** Валянціны, Юліі, Івана, Паўла, Пятра, Фёдара, Якава.*
***К.** Марты, Антона, Канстанціна.*

## ЗАЎТРА






Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Надвор'е

## Даставайце парасоны

**Напрыканцы тыдня ўмовы надвор'я істотна зменяцца. На большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы, а спякота адступіць. Пра гэта паведамілі ў Белгідраметцэнтры.**

Сёння з паўднёвага захаду Еўропы на тэрыторыю Беларусі будуць перамяшчацца актыўныя атмасферныя франты. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Месцамі чакаюцца моцныя лівні і нават град. Падчас выпадзення ападкаў магчыма ўзмацненне ветру да шквалістага. Максімальная тэмпература ўдзень чакаецца ад плюс 22 да плюс 28 градусаў. А на паўднёвым усходзе гарачыня яшчэ ў пятніцу затрымаецца. Там будзе 29-33 градусы вышэй за нуль.

У суботу кароткачасовыя дажджы па-ранейшаму будуць ісці на большай частцы тэрыторыі краіны. Ноччу і раніцай у асобных раёнах прагназуецца слабы туман. Тэмпература ў начны час складзе ад плюс 13 да плюс 20, удзень ртутныя слупкі паднімуцца да +22-29 градусаў.

У нядзелю кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі месцамі. Тэмпература паветра істотна не зменіцца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**29 ЛІПЕНЯ**

**1789** год — на Гродзеншчыне нарадзіўся астраном, матэматык і асветнік Вінцэнт Карчэўскі. Прадстаўнік Віленскай астранамічнай школы. Аўтар навуковых прац па астраноміі (даследаванне яркасці зорак, назіранне планет, камет, астэроідаў), падручнікаў па астраноміі і матэматыцы. Прыхільнік вучэння Каперніка і асветніцкіх ідэй.

**1896** год — 120 гадоў таму ў Вільні нарадзіўся Ігнат Канчэўскі, філосаф, паэт, публіцыст. З 1919 года жыў у Мінску, працаваў у Саўнаргасе, Цэнтрасаюзе спажывецкіх таварыстваў. Аўтар вершаў, палітычных артыкулаў, рэцэнзій. У філасофскім эсэ «Адвечным шляхам» раскрыў драматызм гістарычнага лёсу беларусаў, іх імкненне захаваць незалежнасць свайго духу.

**1817** год — нарадзіўся Іван Канстанцінавіч Айвазоўскі, рускі жывапісец-марыніст, ганаровы член Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1887). Аўтар каля 6 тысяч карцін, малюнкаў, акварэляў, у тым ліку «Дзявяты вал», «Бура на Паўночным моры», «Сярод хваль» і інш. Пісаў таксама батальныя кампазіцыі, жанравыя палотны, партрэты. У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь захоўваюцца карціны «Пётр I каля Краснай Горкі», «Бура», «Месячны пейзаж» і інш.



**1914** год — у сувязі з пачаткам Сусветнай вайны адменены VI летнія Алімпійскія гульні, якія павінны былі адбыцца ў 1916 годзе ў Берліне. Дарэчы, згодна з Алімпійскай хартыяй, за летнімі Алімпіядамі, якія не адбыліся, захоўваюцца іх парадкавыя нумары, таму наступным летнім Гульням 1920 года быў прысвоены нумар «7», і іх вырашана было правесці ў Антвэрпэне (Бельгія). А вось Германія і яе саюзнікі ў Першай сусветнай вайне рашэннем МАК былі адхілены ад удзелу ў гэтай Алімпіядзе.

**1957** год — нарадзілася Нэлі Уладзіміраўна Кім, беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР (1976). У 1992—1995 гадах — дзяржаўны трэнер Беларусі па спартыўнай гімнастыцы сярод жанчын. Чэмпіёнка XXI і XXII Алімпійскіх гульняў (1976, 1980 г.). Абсалютная чэмпіёнка свету (1979), абсалютная чэмпіёнка Спартакіяды народаў СССР (1975).

**Было сказана**

**Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, паэт:**
*У песні ёсць аснова*
*Той таямнічасці жыцця,*
*Перад якой нямее мова*
*Ад лішку мар і пачуцця.*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сапраўдны мужчына павінен прачынацца з думкай: «Божухна, маёй жонцы няма чаго надзець!..»**

— Не глядзіце на фотаздымак, я там страшная! Ад дайце!

— Дзяўчына, супакойцеся! Страхоўку і тэхпашпарт, калі ласка.

**Дзяўчаты!**

**Хочаце каву ў ложак, добрыя словы і салодкі пацалунак на ноч, кветкі і падарункі кожны тыдзень?**

**Ніколі не выходзьце замуж!**

У Афрыцы белыя турысты, купаючыся ў рацэ, пытаюцца перакладчыка:

— Скажыце, што так гучна абмяркоўваюць тубыльцы? І чаму ўся вёска выйшла на бераг?

— О, гэта не пра вас: яны вельмі здзіўлены, якія сёння гультаяватыя кракадзілы!




Малюнак Андрэя СЛУЦКАГА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2905.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 ліпеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12